**За вялікія заслугі ў падрыхтоўцы дыпламаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна атрымаў вялікую ўзнагароду — в'етнамскі ордэн Дружбы.**

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (1208) ● 8 чэрвеня 1978 г. Цана 2 кап.

## Мы—удзельнікі свята «Гаудэамус-7»

Сваё традыцыйнае свята песні «Гаудэамус-7», якое звычайна праходзіць адзін раз у 3—4 гады, студэнты Прыбалтыйскіх рэспублік у гэтым годзе праводзяць у сталіцы Літвы Вільнюсе. У ім звычайна прымаюць удзел мастацкія калектывы сяброўскіх ВНУ з суседніх рэспублік. У гэтым годзе запрашэнне на традыцыйнае свята прыбалтыйскіх студэнтаў атрымалі тры калектывы мастацкай самадзейнасці БДУ — народны аркестр народных інструментаў, народная харавая капэла, народны ансамбль танца «Крыжачок». Усяго ў пачатку ліпеня ў Вільнюс паедуць больш за 160 удзельнікаў нашай мастацкай самадзейнасці.

Гаспадары свята даслалі нашым мастацкім калектывам спецыяльныя праграмы, бо яны ў ходзе свята павінны будуць удзельнічаць у выступленні зводнага хору, зводнага аркестра і зводнага танцавальнага калектыву. Акрамя таго, кожны з нашых калектываў павязе да сяброў сваю асабістую праграму.

Свята песні адбудзецца ў Вільнюсе з 4 па 9 ліпеня.

**Н. КУЗНЯЦОВА,**
**мастацкі кіраўнік клуба БДУ.**

Партыйнае жыццё

# Зверацючыся з патрабаваннямі часу

У дваццаці трох пярвічных партыйных арганізацыях нашага універсітэта прайшлі справаздачна-выбарныя сходы. На іх камуністы факультэтаў, навуковых інстытутаў, лабараторый, спецыяльных кафедр, гаспадарчых падраздзяленняў падвялі вынікі сваёй дзейнасці за мінулы год. Гэта важны год дзесятай пяцігодкі. Ён у многім вызначыў уменне партыйных арганізацый перабудаваць сваю работу так, каб з улікам сучасных патрабаванняў дабіцца яшчэ большай эфектыўнасці, канкрэтнай аддачы палітычнай дзейнасці. Справаздачна-выбарныя сходы яскрава засведчылі, што там, дзе партыйныя арганізацыі па-баявому, прынцыпова і зацікаўлена падыходзяць да арганізацыі вучэбнага працэсу, выхавання кадраў і падрастаючай змены, да ўсяго, чым жыве калектыў, што яго хвалюе, засяроджваюць увагу на вузлавых праблемах падрыхтоўкі і выхавання маладых кадраў, актыўна ўплываюць на фарміраванне грамадскай думкі ў калектыве — там поспех, там ёсць чаму павучыцца.

Не ўсё зроблена за гэты год. Але тое, што зроблена, сведчыць аб істотным павароце партыйных арганізацый да надзённых задач жыцця і дзейнасці калектываў па падрыхтоўцы і выхаванню будучых спецыялістаў. Кожны камуніст глыбока пранікся клопатам аб найбольш поўным і ўсебаковым ажыццяўленні гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ. Дзелавіта, прынцыпова, з глыбокім аналізам праблем развіцця факультэтаў і навуковых фарміраванняў прайшлі сходы ў партыйных арганізацыях гістарычнага, філалагічнага, механіка-матэматычнага, фізічнага, геаграфічнага факультэтаў і факультэта журналістыкі, дэканата па навучанню замежных студэнтаў, НДІ ПФП, СКТБ, выдавецтва і друкарні і інш.

Глыбокі аналіз усіх спраў, імкненне зрабіць яшчэ лепш, знайсці рэзервы, на якія якраз і ўказвалі камуністы, вызначае гэтыя сходы. Адметная рыса— высокая актыўнасць камуністаў на сходах, належная яўка. У спрэчках выступіў кожны дзевяты камуніст, у дзевяці партыйных арганізацыях сходы прайшлі пры стопрацэнтнай яўцы камуністаў.

Справаздачна-выбарным сходам папярэднічала дасканалая падрыхтоўчая работа, вучоба актыву. Партком ажыццяўляў неаслабны кантроль за правядзеннем сходаў. Да іх падрыхтоўкі прыцягваліся радавыя камуністы, партыйны актыў. Істотным вынікам работы партыйнай арганізацыі за мінулы год з'явілася далейшае ўдасканаленне арганізацыйна-партыйнай работы, выкарыстанне разнастайных форм і метадаў, пошукі новых, найбольш эфектыўных метадаў, удасканаленне стылю работы.

У выступленнях камуністаў адзначалася, што партыйныя арганізацыі сталі больш дасканала займацца пытаннямі вучэбнага працэсу. Кантралюючы вучэбную работу на асобных кафедрах (фізфака, філфака), сталі больш дэталёва і глыбока унікаць у стан навукова-даследчай работы (НДІ ПФП, ФПМ, біяфака), садзейнічаць прыцягненню ўсё новых і новых сіл у навуку, абуджэнню прагі да самастойнага навуковага пошуку (хімфака, гістфака). Яркімі радкамі ў летапіс спраў пярвічных партыйных арганізацый упісана велізарная работа па прапагандзе Канстытуцый СССР і БССР, па падрыхтоўцы да святкавання 60-годдзя СССР, а зараз па падрыхтоўцы да святкавання 60-годдзя БССР і КПБ. Значна пашырылася лекцыйная прапаганда, усё новыя і новыя атрады высокакваліфікаваных лектараў уключаюцца ў гэту работу. На гістарычным факультэце грунтоўныя вынікі дае дзейнасць факультэта грамадскіх прафесій, удасканальваецца грамадска-палітычная практыка студэнтаў.

У справаздачны перыяд партыйныя арганізацыі сталі больш удзяляць увагі новаму набору студэнтаў, праяўляць пастаянны клопат аб размеркаванні выпускнікоў на працу. Больш патрабавальнасці праяўляе партбюро да работы ў інтэрнатах. Дзейсным сродкам паляпшэння спраў стала сацыялістычнае спаборніцтва, якое разгарнулася ў калектывах.

Нямала ёсць і праблем ў рабоце партыйных арганізацый, што выявілася на справаздачна-выбарных сходах.

Пытанні падбору, выхавання кадраў — цэнтральная задача партыйных арганізацый. Пра гэта неаднойчы гаварылі камуністы на справаздачных сходах. Ажыццяўленне комплекснай праграмы ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў на ўвесь перыяд навучання, а таксама хутчэйшае ўкараненне сістэмы маральнага выхавання таксама павінна быць у цэнтры ўвагі кожнага члена КПСС.

Перад партыйнымі арганізацыямі стаіць задача, каб ніводнае пытанне не выпадала з поля зроку, каб уплыў камуністаў адчуваўся ва ўсёй дзейнасці калектываў.

Прадметам пастаяннага клопату з'яўляецца рост радоў членаў КПСС і работа з маладымі камуністамі. Партыйныя арганізацыі значна выраслі. Няма ніводнай партарганізацыі, якая б за мінулы год не вырасла. Каля трыццаці вядучых прафесараў, дацэнтаў, супрацоўнікаў прынята ў партыю за мінулы год.

Адкрытая, прынцыповая размова ішла ў дні справаздач і выбараў. Грунтоўны аналіз спраў, зроблены камуністамі на сходах, дае падставы сцвярджаць аб гатоўнасці кожнага прыкласці ўсе намаганні, каб на ўзроўні сучасных патрабаванняў весці падрыхтоўку і выхаванне высокакваліфікаваных спецыялістаў.

**Ул. НАВУМОВІЧ,**





# УНІВЕРСІТЭТ ПРЫМАЕ ЎЗНАГАРОДУ

Адгучалі апошнія акорды гімна дэмакратычнай моладзі. Студэнты і супрацоўнікі універсітэта горача вітаюць дэлегацыю пасольства Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам, якая прыбыла да нас з прыемнай місіяй — уручыць Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Леніна в'етнамскі ордэн Дружбы.

Сакратар партыйнага камітэта БДУ М. С. Гарашчук, які адкрыў урачысты мітынг, прадастаўляе слова саветніку пасольства СРВ у СССР Нгуен Бо Тоаю.

— Мне выпаў вялікі гонар,— сказаў госць, — ад імя Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам уручыць Белдзяржуніверсітэту ордэн Дружбы за яго вялікія заслугі ў падрыхтоўцы навуковых і тэхнічных кадраў для сацыялістычнага В'етнама.

Затым ён коратка расказаў, як працуюць выпускнікі Беларускага універсітэта на прадпрыемствах СРВ. Падзякаваў нашаму выкладчыцкаму саставу за бескарысную перадачу ведаў в'етнамскім студэнтам, выказаў надзею на далейшае ўмацаванне супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ў галіне вышэйшай адукацыі. Затым Нгуен Бо Тоай зачытаў Указ прэзідэнта СРВ аб узнагародзе БДУ ордэнам Дружбы.

І вось зноў у актавай зале універсітэта бурныя апладысменты. Побач з ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга на пурпурным палотнішчы універсітэцкага сцяга саветнік пасольства СРВ у СССР прышпільвае в'етнамскі ордэн Дружбы, на якім — на фоне каласоў рысу — у моцным поціску рукі: сімвал дружбы, братэрства, добрасуседскіх адносін.

Са словамі падзякі ў адказ выступіў рэктар нашага універсітэта прафесар У. М. Сікорскі. Ён адзначыў, што пачэсная ўзнагарода — гэта не толькі высокая ацэнка працы нашага універсітэта, гэта адзнака клопатаў усяго беларускага народа, усёй вышэйшай школы СССР у справе падрыхтоўкі кадраў для сацыялістычнага В'етнама. Падрабязней ён спыніўся на гісторыі падрыхтоўкі в'етнамскіх спецыялістаў у БДУ. Першая невялікая група студэнтаў-фізікаў з В'етнама прыехала да нас яшчэ ў 1962 годзе. Калі ў БДУ быў створан падрыхтоўчы факультэт для замежных студэнтаў, першымі слухачамі яго з'явіліся студэнты з В'етнама. Рэктар БДУ падкрэсліў іх выключную працавітасць, стараннасць, арганізаванасць і глыбокую патрыятычнасць. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, той факт, што з 284 маладых в'етнамскіх спецыялістаў, якія скончылі БДУ, 54 атрымалі дыпломы з адзнакай, а 23 закончылі аспірантуру і паспяхова абаранілі дысертацыі. І гэта нягледзячы на цяжкасці авалодання рускай мовай.

У. М. Сікорскі выказаў вялікую падзяку ад усяго калектыва універсітэта за высокую адзнаку нашай працы і запэўніў, што БДУ будзе і надалей імкнуцца ствараць для студэнтаў з брацкіх краін найлепшыя ўмовы для паспяховай вучобы, каб маладыя спецыялісты, выпускнікі БДУ, былі як мага лепш падрыхтаванымі.

Затым выступілі выкладчыца падрыхтоўчага факультэта Т. І. Анісімава, аспірант з В'етнама Лэ Зьен, студэнт падрыхтоўчага факультэта Чу Зуй Фу, студэнтка біяфака, прэзідэнт клуба інтэрнацыянальнай дружбы універсітэта Вольга Сычова.

Урачыстая частка закончылася выкананнем гімнаў СРВ, СССР і БССР. Потым студэнты БДУ выступілі з канцэртам мастацкай самадзейнасці.

**Т. САХАШЧЫК.**

**На здымках:** мітынг адкрыў сакратар парткома БДУ М. С. Гарашчук; саветнік пасольства СРВ у СССР Нгуен Бо Тоай прышпільвае ордэн Дружбы да сцяга БДУ.

# У ГАСЦЯХ У ПАДШЭФНЫХ

Многія студэнты факультэта журналістыкі вядуць шэфскую работу ў школах г. Мінска. Вось і я дапамагаю школьнікам СШ № 74 Кастрычніцкага раёна арганізоўваць гурткі, выпускаць насценгазету, афармляць фотавітрыны і г. д. З цікавасцю хаджу па школе — тут ёсць усё неабходнае: прасторныя светлыя класы, кабінеты, лабараторыі, спартыўная зала. Усё гэта ў спалучэнні з педагагічным майстэрствам настаўнікаў робіць вучэбна-выхаваўчы працэс насычаным і цікавым.

— Асаблівасцю нашай школы, — расказвае дырэктар Лідзія Кузьмінічна Васільева, — з'яўляецца тое, што вывучэнне французскай мовы тут пачынаецца з першага класа.

Лідзія Кузьмінічна паказвае школьныя майстэрні, сталовую. Выдатнае ўражанне пакідаюць добра аснашчаныя кабінеты.

У школе створан музей Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Каля 300 экспанатаў налічвае ён. Піянерскія атрады атрымалі канкрэтныя заданні па пошуку звестак аб жыцці і дзейнасці ветэранаў Камуністычнай партыі.

Рахунак добрых і цікавых спраў піянераў пастаянна папаўняецца. Нядаўна яны стварылі музей У. І. Леніна, пазнаёміліся і завязалі дружбу з ветэранамі вайны і працы, якія жывуць у мікрараёне школы. Гэтая работа вядзецца пад дэвізам «Подзвіг бацькоў — прыклад для сыноў».

Многа выдатных педагогаў працуе ў школе. Напрыклад, І. Р. Пашчасцева — настаўніца беларускай мовы і літаратуры. Яна вучыць сваіх выхаванцаў быць шчырымі, чулымі, высакароднымі, чалавечнымі.

Рыхтуючыся да кожнага ўрока, у якім бы класе ён ні праходзіў, Ірына Рыгораўна імкнецца скіраваць ідэйна-палітычны і маральны зарад літаратурнага твора на вырашэнне галоўнай мэты — выхаванне дзяцей. Настаўніца выкарыстоўвае любую магчымасць, каб паказаць сваім вучням прыгажосць высакародства, дабраты, шчырасці, выклікаць у іх агіду да благіх учынкаў. І робіць яна гэта заўсёды ўмела, тактоўна, пераканаўча.

Я прысутнічаю разам са сваімі падапечнымі з 8 «Б» класа на ўроку беларускай літаратуры. Гаворка ідзе аб п'есе Янкі Купалы «Раскіданае гняздо». Школьнікі дапаўняюць адзін аднаго, расказваюць, аналізуюць, робяць вывады.

Для лепшага засваення на ўроку праслухоўваюцца запісы гэтага твора Янкі Купалы ў выкананні артысткі Ржэўскай.

— Нашы дзеці, — гаворыць Ірына Рыгораўна, — жывуць у цудоўны час. Мы выхоўваем іх на высакародных прыкладах жыцця заўсёды і ўсюды. Вось на гэтым, ды і на кожным уроку імкнемся не толькі даваць ім трывалыя веды, але клапоцімся і пра той духоўны зарад, які робіць чалавека чалавекам...

Сапраўды высакародная мэта.

А. МАРЧУК.

## ФОТАРЭПАРТАЖ







яна якасна іншая — больш напружаная і трывожная. Да яе заклікаюць надпісы на дзвярах аўдыторый: «Цішэй, ідзе экзамен!». Але іменна каля гэтых надпісаў і больш шумна — нехта ўпаўголаса чытае апошні раз старонку з канспекта, нехта тлумачыць сябру незразумелае пытанне. А ці магчыма стрымаць эмоцыі, калі з запаветных дзвярэй выскоквае аднакурснік з выклікам — «Выдатна!»

— Ну, як?
— Што табе папалася?
— Як апытвае?

Хіба пералічыш усе пытанні, якія абрушваюцца на адздаваўшагася!

А вось на шырокім падаконніку дзве дзяўчыны спрачаюцца аб выкарыстанні нейкага артыкля. Зразумела — здаюць замежную мову. На прыступках лесвіцы юнак шпарка перагортвае старонкі падручніка.

Каля чарговых дзвярэй — натоўп. Аднекуль з самой сярэдзіны яго вылятае пытанне:

— Чым адрозніваецца мараль ад права?

І некалькі галасоў разам спяшаюцца растлумачыць. Гэта чацвёртакурснікі фізфака здаюць марксісцка-ленінскую этыку.

Сесія...

Т. АЛЯКСАНДРАВА.

●

НА ЗДЫМКАХ: заўтра самы складаны экзамен; добра, калі побач таварыш; упэўнена адказвае на заліку студэнт ФПМ Сяргей Бондар; да чарговага экзамена рыхтуюцца студэнты III курса фізфака Турэ Ібрагім і Муса Берэтэ; для падрыхтоўкі неабходна выкарыстаць кожную хвіліну.

Фота М. Дубовіка.

●

## ДА XI СУСВЕТНАГА ФЕСТЫВАЛЮ МОЛАДЗІ І СТУДЭНТАЎ У ГАВАНЕ

# Памяць аб вытоку

«Я ганаруся тым, што жыву ў краіне Леніна, вывучаю яго мову. Калі я вярнуся ў Гвінею, то буду расказваць аб Беларусі, аб сваіх савецкіх сябрах».

Гэта радкі з сачынення гвінейскай студэнткі Кацярын Обрыа. Сачыненне Кацярын было прызнана адным з лепшых на конкурсе, які праходзіў на падрыхтоўчым факультэце нашага універсітэта. У ім прынялі ўдзел студэнты з В'етнама і Гвінеі, Лівана і Малі, Конга і Венесуэлы. Яны расказваюць аб сваіх краінах, разважаюць пра сваё месца ў жыцці. Сярод самых запаветных — думкі аб Леніне, Савецкім Саюзе.

«Аднойчы бацька прынёс дамоў два вялікія партрэты і павесіў іх на сцяну. Гэта былі партрэты У. І. Леніна і Хо Шы Міна, — піша в'етнамскі студэнт Ву Суан Лок. —Тады, у 1963 годзе, мне было толькі восем год, і я ўпершыню ўбачыў іх. Бацька сказаў, што гэта правадыры рэвалюцыі. Словы «правадыр», «рэвалюцыя» былі для мяне зусім новымі. Бацька растлумачыў вельмі проста: «Правадыр рэвалюцыі — гэта чалавек, які кіруе ўсім народам. Калі лічыць, што ўвесь народ — вялікая сям'я, то правадыр — бацька ў гэтай сям'і». Пасля я многа расказваў сябрам аб тым, што ў маёй сям'і ёсць партрэты бацькоў усіх людзей. У 1971 годзе, у дзень нараджэння У. І. Леніна, мы, тады в'етнамскія вучні, глядзелі фільм пра Леніна. Памятаю, калі Ільіч з'явіўся на экране, усе падняліся і доўга апладзіравалі».

З таго моманту мінула шмат гадоў. У арміі Ву Суан Лок вывучаў тэарэтычныя працы Леніна. У Савецкі Саюз ён прыехаў, каб авалодаць прафесіяй інжынера і быць карысным сваёй краіне.

Студэнт з Малі Думбій Муса бачыць, як савецкія людзі працягваюць справу Леніна, жывуць яго запаветамі, ушаноўваюць памяць аб сваім правадыру. Зараз Думбій імкнецца ўзбагаціць свае веды аб заснавальніку першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. З імем Леніна звязваюць студэнты розных краін свае самыя запаветныя мары: аб міры і шчасці для ўсіх людзей на зямлі.

Вайна для многіх з іх — не гісторыя, а зусім недалёкае мінулае і нават сучаснае. А той, хто ведае, што такое вайна, не захоча, каб яна паўтарылася.

Не па расказах ведае пра вайну ліванскі студэнт Насіб Эль Шаар. Два гады ён з тысячамі верных сыноў арабскага народа і палесцінскіх патрыётаў змагаўся за незалежнасць паўднёвых раёнаў Лівана супраць ізраільскіх агрэсараў. У 1972 годзе семнаццацігадовы Насіб, як і яго бацька і тры браты, уступіў у Сацыялістычную партыю Лівана, у партыю, якая змагаецца за мір, незалежнасць, за сацыялізм, за ідэі Леніна.

Нядаўна замежныя студэнты пабывалі ў Хатыні, даведаліся аб трагедыі гэтай і сотняў іншых вёсак у гады Вялікай Айчыннай вайны. Студэнт з Венесуэлы Армандa Барэра піша ў сачыненні аб тым, што раскажа пра Хатынь на сваёй далёкай радзіме.

У сэрцы в'етнамскага студэнта Лі Хыу Фыока трагедыя Хатыні адгукнулася яшчэ адной, не менш жорсткай трагедыяй — трагедыяй вёскі Сангмі.

Перагортваючы старонкі сачыненняў, пераконваешся ў шчырасці іх аўтараў. «Як і кожны чалавек, я люблю сваю радзіму, — піша ў сваім сачыненні в'етнамскі студэнт Ле Ван Цінь. — Народная прыказка сцвярджае: «Калі п'еш ваду, памятай аб вытоку». І наколькі мы любім сваю радзіму, настолькі мы выказваем сваю ўдзячнасць савецкаму народу і вялікаму Леніну». Гэтыя словы ў значнай меры можна аднесці да работ усіх студэнтаў. Яны добра разумеюць, што вытокам шчаслівага жыцця з'яўляюцца цеснае сяброўства паміж народамі і мір на ўсёй зямлі.

А. ЛІПСКІ,
Б. ПРАКОПЧЫК.

## НОВЫЯ КНІГІ, ЯКІЯ ПАСТУШЛІ Ў КАБІНЕТ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК

1. Во имя мира на земле. Советский Союз в борьбе за мир и сотрудничество народов. Кн. I. 1971—1974 гг. М., Политиздат, 1977.
2. Визит Иосипа Броз Тито в Советский Союз. 16—24 августа 1977 года. Речи, документы, материалы. М., Политиздат, 1977.
3. Ленинская теория империализма и современность. Под ред. акад. Н. Н. Иноземцева и др. М., «Мысль», 1977.
4. Коммунистическое воспитание студентов в процессе преподавания истории КПСС. (Из опыта работы со студентами, обучающимися без отрыва от производства). М., «Высшая школа», 1977.
5. Исторический опыт Великого Октября и критика буржуазной историографии. Под ред. Л. С. Гапоненко и К. В. Гусева. М., «Мысль», 1977.
6. Федюкин С. А. Борьба с буржуазной идеологией в условиях перехода к НЭПу. М., «Наука», 1977.
7. Шестаков С. В. Историография деятельности большевистской партии в период первой мировой войны и Февральской революции. М., Изд-во Моск. ун-та, 1977.
8. Вопросы теории и методов идеологической работы. Вып. 8. Трудовой коллектив — важная ячейка коммунистического воспитания. Ред. коллегия: Курочкин П. К. (гл. редактор) и др. М., «Мысль», 1977.
9. Международно - правовые формы сотрудничества государств в Европе. Под ред. проф. О. Н. Хлестова. М., «Международные отношения», 1977.
10. Голосов В. В. Теории вывоза капитала. М., «Мысль», 1977.
11. Кредитование и расчеты в промышленности. Учебник для вузов. Под ред. Р. В. Корнеевой. М., «Финансы». 1977.
12. Голубков Е. П. Использование системного анализа в отраслевом планировании. М., «Экономика», 1977.
13. Экономика и организация промышленного производства. Вып. 6. Проблемы экономики качества в промышленности. Гл. ред. Н. А. Лисицын. Минск, «Вышэйшая школа», 1977.
14. Сванидзе И. А. Сельское хозяйство и аграрный строй тропической Африки. М., «Наука», 1977.
15. Гончарук С. И. Общественные законы и закономерности. М., Политиздат, 1977.
16. Структура морали и личность. Под ред. С. Анисимова. (Руководитель авт. коллектива) и Р. Миллера. М., «Мысль». 1977.
17. Биологическое и социальное в развитии человека. Ред. коллегия: член-корр. АН СССР Б. Ф. Ломов (отв. ред.) и др. М., «Наука», 1977.
18. Адамеску А. А., Белоусов Д. В. Развитие и размещение призводительных сил СССР в десятой пятилетке. М., «Мысль», 1977.

Н. СЛАВІНСКАЯ.

